УДК 811.161.3(072)

# ЧЫТАННЕ ЯК БЕЗАЛЬТЭРНАТЫЎНЫ ШЛЯХ СУЧАСНАЙ ШКОЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ

**Л.С. Васюковіч**
*Установа адукацыі "Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава"*

*Праблема чытання навучэнцаў разглядаецца ў рэчышчы захавання і развіцця культуры ў сучасным грамадстве. У працэсе актыўнага станаўлення чытацкага вопыту неабходна задзейнічаць комплекс сацыяльна-педагагічных сродкаў: дыдактычны патэнцыял школьных падручнікаў, бібліятэчныя, электронныя, сямейныя, інфармацыйныя рэсурсы.*

*Мэта артыкула – абгрунтаваць эфектыўнасць сацыяльна-педагагічных рэсурсаў у фарміраванні паўнацэннага чытача ў кантэксце маўленча-культурнага асяроддзя вучня.*

***Матэрыял і метады.*** *Пры аглядзе навукова-метадычнай літаратуры па праблеме даследавання выкарыстаны комплекс метадаў – тэарэтычных (аналіз, абагульненне і сінтэз пазіцый даследчыкаў тэорыі чытання), эмпірычных (вывучэнне нарматыўна-прававых дакументаў сферы адукацыі, педагагічнага вопыту).*

***Вынікі і іх абмеркаванне.*** *У выніку праведзенага даследавання даказана мэтазгоднасць асэнсавання чытання як фактару фарміравання агульнакультурных каштоўнасцей асобы і грамадства.*

***Заключэнне.*** *Далучэнне маладога пакалення да культуры чытання, развіццё чытацкіх інтарэсаў асобы на ўсіх ступенях адукацыі – найважнейшая задача школы. У гэтым працэсе павінна быць задзейнічана сукупнасць сацыяльна-педагагічных рэсурсаў – дыдактычных, бібліятэчных, электронных, сямейных, інфармацыйных.*

***Ключавыя словы:*** *чытанне, культура чытання, чытацкі вопыт, фарміраванне ўменняў паўнацэннага чытання, сацыяльна-педагагічныя рэсурсы чытання.*

# READING AS A NON-ALTERNATIVE PATH OF MODERN SCHOOL EDUCATION

**L.S. Vasiukovich**
*Education Establishment "Vitebsk State P.M. Masherov University"*

*The problem of students' reading is considered in the context of the preservation and development of culture in modern society. In the process of active development of reading experience, it is necessary to use a complex of social and pedagogical means: didactic potential of school textbooks, library, electronic, family and information resources.*

*The purpose of the article is to substantiate the efficiency of social and pedagogical resources in the formation of a full-fledged reader in the context of the student's cultural and speech environment.*

***Material and methods.*** *When reviewing scientific and methodological literature, a set of methods was used – theoretical (analysis, generalization and synthesis of the positions of researchers in the theory of reading), empirical (study of regulatory documents in the field of education, pedagogical experience).*

***Findings and their discussion.*** *As a result of the study, the feasibility of understanding reading as a factor in the formation of general cultural values of the individual and society was proved.*

***Conclusion.*** *Introducing the younger generation to the culture of reading, developing the reading interests of individuals at all levels of education is the most important task of the school. This process should involve a set of social and pedagogical resources – didactic, library, electronic, family, information.*

***Key words:*** *reading, reading culture, reading experience, formation of wholesome reading skills, social and pedagogical reading resources.*

Пытанне пра ролю чытання ў фарміраванні інтэлектуальных здольнасцей асобы пастаянна знаходзілася ў цэнтры ўвагі прагрэсіўных педагогаў і грамадскіх дзеячаў. "Першавобраз" метадычнай сутнасці чытання фарміруецца ў працах XIX стагоддзя. Чытанне трактуецца ў якасці неабходнай састаўной гуманітарнай адукацыі. Пачынаючы з традыцыі, закладзенай у кнізе "О преподавании отечественного языка" (1818 год) Ф.І. Буслаева, чытанне разглядаецца як аснова тэарэтычных

і практычных ведаў. Знакаміты філолаг, заснавальнік навуковай методыкі выкладання мовы ў сярэдняй школе фармуляваў прызначэнне кнігі, асветы наступным чынам: “Чытанне фарміруе розум і нясе святло ў маладыя душы, каб асвяціць іх разважлівасцю і дабрачыннасцю” [1, с. 27].

Ідэі Ф.І. Буслаева атрымалі развіццё ў метадычных дапаможніках наступных пакаленняў педагогаў. Паслядоўнік Ф.І. Буслаева У.П. Шарамецеўскі сцвярджаў: “Галоўная мэта выкладання мовы і славеснасці – навучыць чытаць і пісаць у шырокім значэнні гэтага слова, г.зн. давесці да разумення вучняў, каб яны былі гатовы растлумачыць пабудову прачытанага твора, маглі зразумець сістэму ідэй, што заключаюцца ў ім, былі падрыхтаваныя правільна ў лагічных і граматычных адносінах выказвацца і пісаць… Чытанне неабходнае дзеля агульначалавечага самаўдасканалення наогул і ўдасканалення дару слова ў прыватнасці” [2, с. 37]. Аўтар прац па навучанні ў пачатковых класах Ц.П. Балталон перад урокамі чытання ставіў наступныя мэты: “Уплываць на разумовае і маральнае развіццё, а таксама – на ўзбагачэнне маўлення вучняў; спрыяць сяброўству з кнігай і навучыць карыстацца ёю так, каб пасля заканчэння школы чытанне з’яўлялася пастаяннай патрэбнасцю і дапамогай у жыцці… Галоўная задача школы – навучыць свядомаму, разумнаму чытанню і абудзіць далейшую цікавасць да кнігі” [3, с. 56].

Савецкая педагогіка культывавала тэксты, скіраваныя на *ўдумлівае, глыбокае, аналітычнае чытанне*. Чытанне арыентавала як на разуменне прачытанага, так і на маральнае выхаванне, паўнацэннае развіццё асобы. Педагагічныя працы прапаноўвалі розныя варыянты вучэбнага чытання, якое нязменна мела на ўвазе выхаваўчыя моманты. Атрымала метадычную распрацоўку *аналітычнае чытанне*, у ходзе якога дабіваліся разумення вучнямі тэксту, вылучалася таксама *выразнае, пазакласнае, дамашняе, чытанне на лета* [4, с. 57]. Сучасныя даследчыкі фармулююць асноўныя задачы чытання як развіццё інтэлекту і культуры чалавека, падкрэсліваюць яго сацыяльную актыўнасць, ролю ва ўдасканаленні творчых здольнасцей асобы, уменняў дыялагічных зносін з аўтарам і тэкстам. Знакаміты айчынны метадыст В.У. Протчанка сцвярджае: “Праблема выпрацоўкі навыкаў чытання становіцца найгалоўнейшай не толькі ў школьным курсе роднай мовы, але і ў іншых галінах методыкі і практыкі навучання” [5, с. 122].

Як вядома, чытацкая актыўнасць у педагагічным кантэксце абумоўлена стадыямі выхавання і навучання. На думку метадолагаў чытацкай дзейнасці (Т.Г. Галактыёнава, Ю.П. Мяленцьева, Н.М. Святлоўская, Н.М. Смятаннікава, Н.С. Старжынская, Н.А. Стэфаноўская і інш.), на сённяшні дзень актыўна фарміруюцца негатыўныя тэндэнцыі ў дзіцячым/школьным чытанні, што прыводзіць да сістэмнага крызісу чытацкай культуры [6, с. 6–7]. Фарміраванне чалавека-чытача – *Homo Legens* – найпершая задача агульнай сярэдняй адукацыі, грамадскі клопат пра яго агульнакультурны ўзровень, станаўленне чытацкіх інтарэсаў, фарміраванне *культуры чытання,* якая разумеецца як “комплекс навыкаў у працы з кнігай, што ўключае асэнсаваны выбар тэматыкі, сістэматычнасць і паслядоўнасць чытання, а таксама ўменні знаходзіць патрэбную літаратуру, карыстацца даведачным апаратам, прымяняць рацыянальныя прыёмы, засвойваць і ўспрымаць прачытанае” [7, с. 186]. Па меркаванні Н.М. Святлоўскай, вырашальнымі ў адносінах да кнігі і чытання становяцца першыя тры-чатыры гады жыцця [8, с. 142]. Можна сцвярджаць, што бацькі/выхавальнікі ў дзіцячым садзе – першыя дарослыя ў жыцці дзіцяці, ад якіх залежыць, ці адбудзецца сустрэча з кнігай і ў якой ступені яна будзе цікавай і радаснай.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам паслужыла тэкстатэка заданняў школьных падручнікаў па беларускай мове (9–11 класы), арыентаваных на чытанне тэкстаў. Пры аглядзе навукова-метадычнай літаратуры выкарыстаны комплекс метадаў – тэарэтычных (аналіз, абагульненне і сінтэз пазіцый даследчыкаў тэорыі чытання), эмпірычных (вывучэнне нарматыўна-прававых дакументаў сферы адукацыі, абагульненне педагагічнага вопыту).

**Вынікі і іх абмеркаванне.** У сучасным інфармацыйным грамадстве дзіця яшчэ ў дашкольным узросце, не маючы элементаргага чытацкага вопыту, падпадае пад уздзеянне тэлевізійных перадач, мабільных прылад рознага роду і набывае першасныя аўдыявізуальныя ўменні. Калі гэтыя ўменні не развіваць, не паглыбляць, не суправаджаць актыўным маўленнем, арганізаваным бацькамі, выхавальнікамі, дзіця застаецца ў свеце пасіўнага ўспрымання малюнкаў і ілюстрацый. Зрокава-невербальны рад павінен выступаць у якасці арыенціраў, сігналаў, што канцэнтруюць увагу дзіцяці на галоўным – на гаварэнні, на істотных дэталях, з’яўляюцца стымулам для гутаркі і дапамагаюць сказаць “сваё”

слова, канструяваць уласнае міні-выказванне. На першым этапе малюнкі, ілюстрацыі, дыяфільмы, фотаздымкі паступова – пры ўмове граматнага кіраўніцтва дарослага – разгортваюць зместавую інфармацыю, паколькі арыентуюць на аднаслоўныя адказы: *хто? што? які? дзе? калі? як?* Замацаваўшы першапачатковае "агучванне" карцінкі, можна пераходзіць на этап сэнсавай інфармацыі: *які герой? чаму ён так зрабіў? для чаго?* Толькі ў такім выпадку малюнкі набываюць значэнне, адпаведнае згорнатаму расказванню-апісанню, вербальнаму способу падачы "зашыфраванай" у іх інфармацыі. Важнасць працы з малюнкамі як умова будучага асэнсаванага чытання падкрэсліваў Л.С. Выгоцкі ў даследаваннях, прысвечаных станаўленню вышэйшых псіхічных функцый дзіцяці: "Малюнкі з'яўляюцца графічным маўленнем, якое выступае прадвеснікам славеснага маўлення. Мадэлі, якія адрозніваюць першыя малюнкі, у гэтым сэнсе паведамляюць толькі істотныя прыметы прадметаў" [9, с. 159].

Вучоныя сцвярджаюць: парытэтнае суіснаванне традыцыйнага і электроннага фарматаў падачы інфармацыі магчымае пры ўмове, што першаснае знаёмства з "жывой" кнігай адбываецца ў эмацыянальным станоўчым кантэксце. Жаданне чытаць праяўляецца ў дзяцей у тым выпадку, калі дарослыя валодаюць тэхнікай выразнага чытання і элементамі тэатралізацыі. Працэс чытання становіцца займальным, калі сумесна разглядаюцца і каменціруюцца якасныя каляровыя ілюстрацыі, абмяркоўваюцца цікавыя дэталі (касцюмы герояў, выраз іх твараў, паслядоўнасць падзей, сюжэтныя лініі і г.д.). Чытанне ў традыцыйнай і электроннай формах аб'ядноўваецца цэласнай задачай фарміравання культуры чытання/слухання: здольнасцю да асэнсавання і рэфлексіі зместу тэксту, выкарыстання прачытанага для стварэння ўласных ацэнак.

Малодшыя школьнікі праяўляюць высокую актыўнасць у працы з кнігай, ахвотна выконваюць творчыя заданні на аснове прачытанага. У тых выпадках, калі ў сям'і не ўсведамляецца роля чытання ў развіцці асобы, менавіта школа павінна выконваць кампенсатарную функцыю ў фарміраванні кніжнага асяроддзя дзіцяці, у станаўленні яго чытацкіх традыцый і інтарэсаў. Разнастайныя формы працы з кнігай маюць на ўвазе ўменні выбару кніг, усвядомленай чытацкай дзейнасці, забяспечваюць станоўчыя эмоцыі ад сустрэчы з мастацкім тэкстам, вучаць выяўляць пазіцыю аўтара/героя, дапамагаюць фармуляваць уласныя адносіны да прачытанага. Калі роля кнігі ў сям'і не акцэнтуецца, працягваецца бескантрольны працэс фарміравання гледача і прыпыняецца станаўленне дзіцяці як чытача, не прывіваецца культура чытання.

Разуменне высокага статусу кнігі ў сям'і забяспечвае развіццё такіх кампанентаў культуры чытання, як веданне правіл карыстання кнігай (прызначэнне закладкі, асцярожнае абыходжанне з кнігай), паводзіны ў бібліятэцы, арыентацыя ў аддзеле дзіцячых выданняў, уменне сфармуляваць сваё жаданне знайсці патрэбную кнігу, знаёмства з асноўнымі элементамі выдання – вокладкай, пераплётам, форзацам, ілюстрацыяй, прадмовай, зместам, працай пісьменніка, мастака, бібліятэкара і інш.

Надзвычай вялікі ўплыў на фарміраванне цікавасці да чытання мае найбліжэйшае акружэнне дзіцяці – бацькі, сваякі, настаўнікі, сябры. Менавіта ад маўленча-культурнага асяроддзя залежаць наяўнасць або адсутнасць у сям'і чытацкіх традыцый, сямейнай бібліятэкі, звычка абмяркоўваць прачытанае/прагледжанае. Аптымальны варыянт у гэтых адносінах – адукацыйна-выхаваўчая прастора ў школе і ў пазашкольным жыцці, паколькі "літаратурнае і – шырэй – мастацкае развіццё школьнікаў у культурным вакууме немагчымае" [8, с. 26]. Істотна падкрэсліць: культурнае асяроддзе падразумявае актыўную дзейнасць у свеце кніг. Адпаведна матываванае станаўленне чытацкіх уменняў вызначае не наяўнасць, не аб'ём дамашняй бібліятэкі, а ўсвядомленая, зацікаўленая дзейнасць маленькага чытача. Паспяхова пераадолець бар'ер засваення тэхнікі чытання (правільнасць, выразнасць, тэмп) могуць малодшыя школьнікі, у якіх да пачатку вучобы ў школе сфарміравалася патрэбнасць у зносінах з кнігай, уменне самастойнага звароту да кніг, маецца вопыт успрымання мастацкай літаратуры.

Перыяд школьнага дзяцінства, калі дзіця ператвараецца ў чытача, – самы складаны ў метадычным плане. Станаўленню вопыту паспяховага чытача на гэтым этапе садзейнічаюць:

– традыцыі сямейнага чытання;

– кніжныя выстаўкі, якія пастаянна арганізуюцца ў класе. Каб выстаўка мела рэальны эфект, яна павінна быць "жывой". Кнігі для выстаўкі прыносяць настаўнікі, дзеці, бацькі. Кнігі разглядваюцца, чытаюцца, абмяркоўваюцца, пры жаданні іх можна ўзяць для чытання дадому. З дапамогай бацькоў, педагогаў рыхтуюцца невялікія паведамленні пра любімую казку, верш, музеі, прысвечаныя дзейнасці пісьменнікаў, мультфільмы, спектаклі паводле дзіцячых твораў, сустрэчы ў дзіцячых бібліятэках.

Назапашванню чытацкага вопыту спрыяюць вучнёўскія "кніжныя" праекты. Яны могуць мець наступную тэматыку:

– "Кніга ў маёй сям'і" (праект можа быць выкананы ў форме інтэрв'ю з бацькамі пра любімыя кнігі, гісторыі іх з'яўлення ў дамашняй бібліятэцы, сямейныя традыцыі шанавання кнігі і г.д.);

– "Парады сябра", гэты праект фарміруе ўменні слухаць субяседніка, улічваць яго меркаванне, пазіцыю, весці дыялог, задаваць пытанні, аргументаваць уласнае ўражанне пра кнігу;

– "Старонкі любімай кнігі": пераказ любімых эпізодаў кнігі, выпісванне і тлумачэнне цытат, якія запомніліся, прымусілі задумацца;

– "Класны дзень паэзіі": чытанне любімых вершаў на памяць, выкананне заданняў "Спрабуем пісаць вершы" (дапісванне радкоў у прапанаваных чатырахрадкоўях);

– "Мая бібліятэка": апавяданне на аснове гатовых пытанняў пра дамашнюю/школьную/гарадскую бібліятэку, любімыя кнігі, працу бібліятэкара, разважанне на тэму "Які я чытач?", састаўленне "Залатой паліцы", на якой "жывуць" любімыя кнігі.

У аспекце чытання хочацца паразважаць у кантэксце пытання: якім павінен быць сучасны школьны ўрок? Ад маладых настаўнікаў найчасцей можна пачуць самы просты адказ: насычаны інфармацыйна-камунікатыўнымі тэхналогіямі. З аднаго боку, гэта так, трэба ўлічваць патрабаванні часу. Інтэрнэт на запыт *сучасныя метады навучання* прапануе пералік з 10–15 назваў (як правіла, у англамоўным афармленні). Адпаведна "міфілагізаваны" вобраз сучаснага ўрока часта фарміруецца на аснове тэхналогій, якія ўзводзяць на метадычны алімп прыёмы працы з розных сфер – вышэйшай адукацыі (дыстанцыйнае вывучэнне матэрыялу, дэбаты, дыскусіі, эсэ і інш.); бізнесу (трэнінгі, мазгавы штурм, дзелавыя гульні, кейсы, інфаграфіка і інш.), забаў, адпачынку (квест, коўчынг, кансалтынг, гейміфікацыя і інш.). У гэтай шматстайнасці метадаў, прыёмаў дастаткова цяжка выявіць пэўныя інварыянтныя, універсальныя ідэі. За калейдаскопам "модных" назваў не павінна загубіцца галоўнае, сутнаснае: урок/заняткі варта ацэньваць не на аснове пераліку выкарыстаных метадаў і прыёмаў, а паводле рэальнага эфекту, вырашэння запланаваных задач: быў ён змястоўным або беззмястоўным, эфектыўным (з пункту погляду дасягнення мэты) або фармальным, разлічаным на знешні эфект, эмацыянальна-асобасным або адчужаным, выклікаў ён рэакцыю тых, каго вучылі і выхоўвалі, якую – зацікаўленую, натхнёную, дзейнасную, камунікатыўную.

Наш адказ такі: сучасны ўрок – той, які адпавядае часу, рэалізуе разумовы патэнцыял навучэнца, фарміруе асобасныя кампетэнцыі, вучыць камунікаваць, вырашаць пазнавальныя і жыццёвыя задачы. І абавязкова той, які вучыць *чытанню як інтэлектуальнай, духоўнай працы.*

**Заключэнне.** Аналіз айчыннага і замежнага вопыту далучэння школьнікаў да кнігі выяўляе: праблема чытання на сённяшні дзень стала прадметам навукова-педагагічнага абмеркавання, набыла грамадскую значнасць, атрымала агульнанацыянальнае і міжнароднае гучанне. У гісторыі культуры чытання маюць месца розныя мадэлі, абумоўленыя асаблівасцямі сацыякультурных умоў, норм, адобраных грамадствам, практыкай актуалізацыі чытання ў нацыянальных установах адукацыі. Для сучаснай айчыннай школы ўласціва мадэль, у кантэксце якой "навучанне чытанню, абуджэнне цікавасці да кнігі, патрэбнасці ў ёй становіцца адной з галоўных задач адукацыі" [10, с. 38]. Агульнапрызнаным у беларускай педагагічнай супольнасці з'яўляецца разуменне чытання як фактару фарміравання агульнакультурных каштоўнасцей асобы і грамадства. На ўзроўні дзяржаўных стандартаў засведчана, што чытанне непасрэдна ацэньваецца як рэсурс павышэння ўзроўню функцыянальнай пісьменнасці.

У вырашэнні гэтай задачы павінны быць задзейнічаны сацыяльна-педагагічныя рэсурсы фарміравання патрэбнасці ў чытанні:

– *дыдактычны патэнцыял школьных падручнікаў*: разнастайныя прыёмы, што ствараюць пазітыўны імідж чытача, выпрацоўваюць каштоўнасныя адносіны да чытання: паэтычныя марафоны, акцыі "Чытаем кнігі на беларускай мове", дыялогавыя пляцоўкі, удзел у святкаванні Дня друку, Дня пісьменнасці, Тыдня дзіцячай літаратуры, у рэкламе кніжных навінак і інш.;

– *бібліятэчныя рэсурсы*: мерапрыемствы па распаўсюджванні кнігі і чытання (фестывалі, акцыі, конкурсы), абнаўленне фондаў бібліятэк, стварэнне камфортнага асяроддзя для чытачоў;

– *электронныя рэсурсы*: свабодны доступ да дзіцячай літаратуры ў электронным фармаце, кніжныя інтэрнэт-праекты для дзяцей, развіццёвыя камп'ютарныя гульні, інтэрнэт-конкурсы, стварэнне мультфільмаў на аснове мастацкіх твораў;

– *сямейныя рэсурсы*: развіццё традыцый сямейнага чытання, сустрэчы з бацькамі – актыўнымі карыстальнікамі бібліятэк;

– *інфармацыя пра рэспубліканскія мерапрыемствы*, скіраваныя на падтрымку кнігі і культуры: Нацыянальны конкурс “Золотая Литера”, Міжнародная спецыялізаваная выстаўка “СМІ ў Беларусі” (праводзіцца з 1997 года), Нацыянальны конкурс “Мастацтва кнігі” (праводзіцца з 1960 года), “Мінская міжнародная кніжная выстава-ярмарка”, рэспубліканскі конкурс “Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры”, падзеі, прымеркаваныя да юбілеяў знакамітых беларускіх кніжнікаў і інш.;

– *рэсурсы аўтарытэтных людзей*: прапаганда чытання вядомымі артыстамі, пісьменнікамі, дзяржаўнымі дзеячамі, кіраўнікамі ўстаноў адукацыі, культуры, прадстаўнікамі розных прафесій.

Толькі інтэграванасць культурна-арыентаваных практык усіх суб’ектаў адукацыйнай прасторы здольна вырашыць галоўную задачу – выгадаваць пакаленне, годнае сваёй краіны, школы, сям’і, выхаванае ў кантэксце павагі да чалавека, мовы, кнігі. Неабходныя сумесныя намаганні ў сферы праектавання адукацыйнага асяроддзя, якое фарміруе патрэбнасць у кнігах, актуалізуе станоўчы імідж чытання для пакалення “лічбы”.

Выхаванне паўнацэннага чытача – надзённая праблема сучаснай школьнай адукацыі. Далучэнне дзяцей да чытання, да культуры вуснага і пісьмовага слова выступае неабходнай умовай фарміравання свядомага маладога пакалення Беларусі. Падтрымку і развіццё дзіцячага чытання неабходна разглядаць як прыярытэтны накірунак культурнай і адукацыйнай палітыкі, якая стварае агульнакультурны партрэт краіны.

*ЛІТАРАТУРА*


1. Буслаев, Ф.И. О преподавании отечественного языка: учеб. пособие / Ф.И. Буслаев. – М.: ЛИБРОКОМ, 2016. – 374 с.
2. Шереметевский, В.П. Сочинения В.П. Шереметевского / В.П. Шереметевский. – М.: Товарищество типографии А.И. Мамонтова, 1897. – 330 с.
3. Балталон, Ц.П. Воспитательное чтение / Ц.П. Балталон. – 3-е изд. – М.: Типография Вильде, 1914. – 315 с.
4. Васюковіч, Л.С. Праца з тэкстам як аснова фарміравання функцыянальнай пісьменнасці вучняў: манаграфія / Л.С. Васюковіч. – Віцебск: ВДУ імя П.М. Машэрава, 2024. – 177 с.
5. Протчанка, В.У. Актуальныя праблемы тэорыі і практыкі навучання беларускай мове / В.У. Протчанка. – Мінск: НІА, 2001. – 212 с.
6. Сметанникова, Н.Н. Стратегиальный подход к обучению чтению: междисциплинарные проблемы чтения и грамотности / Н.Н. Сметанникова. – М.: Школьная библиотека, 2005. – 509 с.
7. Словарь-справочник по чтению: практикум / В.А. Бородина, С.М. Бородин. – М.: РШБА, 2017. – 231 с.
8. Светловская, Н.Н. Основы науки о читателе: теория формирования типа правильной читательской деятельности / Н.Н. Светловская. – М.: Магистр, 1993. – 180 с.
9. Выготский, Л.С. Мышление и речь / Л.С. Выготский // Хрестоматия по общей психологии / под ред. В.В. Петухова. – М.: Изд-во МГУ, 1981. – С. 153–175.
10. Яленскі, М.Г. Лінгвадыдактычная парадыгма асобасна арыентаванага навучання мове ў сучаснай школе: манаграфія / М.Г. Яленскі. – Мінск: НІА, 2012. – 211 с.


*REFERENCES*


1. Buslayev F.I. *O prepodavanii otechestvennogo yazyka: ucheb. posobiye* [About Teaching Mother Tongue], M.: LIBROKOM, 2016, 374 p.
2. Sheremetevskiy V.P. *Sochineniya V.P. Sheremetevskogo* [Works by V.P. Sheremetevskiy], M.: Tovarishchestvo tipografii A.I. Mamontova, 1897, 330 p.
3. Baltalon Ts.P. *Vospitatelnoye chteniye* [Educational Reading], M.: Tipografiya Vilde, 1914, 315 p.
4. Vasyukovich L.S. *Rabota s tekstom kak osnova formirovaniya funktsionalnoy gramotnosti uchashchikhsya: monografiya* [Work with Text as the Basis for Shaping Student Functional Literacy: Monograph], Vitebsk: VGU imeni P.M. Masherova, 2024, 177 p.
5. Protchenko V.U. *Aktualnyye problemy teorii i praktiki obucheniya belorusskomu yazyku* [Current Issues of the Theory and Practice of Teaching Belarusian], Minsk: NIO, 2001, 212 p.
6. Smetannikova N.N. *Strategialnyy podkhod k obucheniyu chteniyu: mezhdistsiplinarniye problemy chteniya i gramotnosti* [Strategy Approach to Teaching Reading: Interdisciplinary Issues of Reading and Literacy], M.: Shkolnaya biblioteka, 2005, 509 p.
7. *Slovar-spravochnik po chteniyu: praktikum* [Vocabulary-Directory on Reading: Practice Book], V.A. Borodina, S.M. Borodin, M.: RSHBA, 2017, 231 p.
8. Svetlovskaya N.N. *Osnovy nauki o chitatele: teoriya formirovaniya tipa pravilnoy chitatelskoy deyatelnosti* [Basics of the Science of the Reader: Theory of the Formation of the Correct Reader Activity Type], M.: Magistr, 1993, 180 p.
9. Vygotskiy L.C. *Khrestomatiya po obshchey psikhologii* [Anthology of General Psychology], M.: Izd-vo MGU, 1981, pp. 153–175.
10. Elensky N.G. *Lingvadydaktychnaya paradygma asobasna ariyentavanaga navuchannia move u suchasnai shkole: managrafiya* [Lingvodidactic paradigm of personality-oriented language teaching in modern school: monograph], Minsk: NIO, 2012, 211 p.


*Паступіў у друк 10.01.2025*

***Адрас для карэспандэнцыі:*** e-mail: mila.vasuk@yandex.by – Васюковіч Л.С.